# ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

**УДК 821.161.3.09(092)**

**Анапрэенка Наталля Якаўлеўна**
кандыдат філалагічных навук,
вядучы рэдактар выдавецкага аддзела
Нацыянальная бібліятэка Беларусі
г. Мінск, Беларусь

**Natallia Anapreyenka**
PhD in Philology,
Leading Editor of the Publishing Department
National Library of Belarus
Minsk, Belarus
anapreenkanatalla@gmail.com

## ГНАСЕАЛАГІЧНАЯ І ЭСТЭТЫЧНАЯ ПАРАДЫГМЫ Ў ЛІТАРАТУРЫ ПАЧАТКУ XX ст. (на прыкладзе творчасці М. Багдановіча)

## EPISTEMOLOGICAL AND AESTHETIC PARADIGMS IN LITERATURE OF THE EARLY 20TH CENTURY (Using the Example of M. Bagdanovich's Creativity)

Артыкул прысвечаны разгляду творчасці М. Багдановіча, аднаго з самых яскравых прадстаўнікоў беларускай літаратуры пачатку XX ст., які займае асаблівае месца ў культурнай прасторы свайго часу. Яго дзейнасць не толькі выяўляе нацыянальныя асаблівасці, але і дэманструе глыбокую сувязь з еўрапейскімі літаратурнымі традыцыямі. Змена эпістэмалагічнай і эстэтычнай парадыгмаў у культуры адзначанага перыяду знайшла сваё адлюстраванне ў творчасці беларускага майстра слова. Маштабнасць і шматстайнасць перамен паўплывала на яго пісьменніцкую практыку, станаўленне творчай індывідуальнасці, дазволіла выказаць важныя светапоглядныя праблемы праз прызму ўласных твораў.

Ключавыя словы: *міжнацыянальныя літаратурныя сувязі*; *творчая індывідуальнасць*; *мадэрнізм*; *сімвалізм*; *фальклор*; *міфалогія*.

The article is devoted to consideration of the work of M. Bagdanovich, one of the brightest representatives of Belarusian literature of the beginning of the 20th century, who occupies a special place in the cultural space of his time. His work not only reflects national characteristics, but also demonstrates a deep connection with European literary traditions. The change in epistemological and aesthetic paradigms in the culture of the noted period was reflected in the activities of the Belarusian master of words. The scale and diversity of changes influenced his writing practice, the formation of creative individuality, and allowed him to express important ideological problems through the prism of his own works.

Key words: *international literary connections*; *creative individuality*; *modernism*; *symbolism*; *folklore*; *mythology*.

Пачатак XX ст. увайшоў у гісторыю як перыяд бурных змен і інавацый у культуры. Гэта імклівы і прадуктыўны час сцвярджэння новых мастацкіх ідэй, зараджэння новых літаратурных плыней і іх супрацьстаяння з традыцыйнымі рэалістычнымі канцэпцыямі. Тагачасная еўрапейская літаратура характарызуецца інтэнсіўным развіццём і ўзаемапранікненнем разнастайных напрамкаў (рэалізму, імпрэсіянізму, сімвалізму, экспрэсіянізму, неарамантызму і інш.), адрозніваецца неаднароднасцю, парадаксальнасцю, змешанасцю розных жанраў і стыляў, якія ўступалі ў самае нечаканае ўзаемадзеянне ў пісьменніцкай практыцы адных і тых жа пісьменнікаў, ствараючы арыгінальнае і непаўторнае адзінства. Як адзначыў П. Васючэнка, «у гэтым часе цяжка вызначыць каго-небудзь з творцаў як “чыстага” рэаліста, сімваліста або мадэрніста. Мы назіраем у кожнай нацыянальнай літаратуры перапляценне і складаныя кантамінацыі рэалізму, новарамантызму, мадэрнізму, сімвалізму, імпрэсіянізму і нават новага класіцызму. Кожны буйны майстра гэтай эпохі выглядаў сінтэтыкам» [1, с. 3].

Для мастацтва гэтага перыяду ўласціва імкненне да свабоды, творчай рэалізацыі і ўласнага самасцвярджэння асобы, узмацненне індывідуальнага пачатку, арыентацыя на суб’ектыўнае спасціжэнне навакольных рэалій, на навацыі і эксперымент. Адбываюцца актыўныя змены ў мастацкай свядомасці, трансфармацыя самога працэсу творчасці: «Відаць, упершыню ў гісторыі літаратуры назіраецца татальнае разбурэнне канона, ігнараванне клішыраваных формаў, якія стрымлівалі рост літаратуры, скоўвалі мастацкую фантазію творцы. Заўважаецца тэндэнцыя паступовай жанравай раскаванасці, адыходу ад строгай рэгламентацыі стылявых, структурна-кампазіцыйных і мастацка-вобразных формаў. <...> Мноства пунктаў погляду, узаеманакладанне розных сэнсавых палёў, амбівалентнасць зместу, шматстылёвасць і полівaрыянтнасць – усё гэта легла ў аснову эстэтычных прынцыпаў новага мастацтва», – доказна даводзіць В. Максімовіч [2, с. 12].

Блізкія ўмовы тагачаснага развіцця дазваляюць весці размову пра падабенства гістарычна-культурных працэсаў у краінах еўрапейскага рэгіёну, якія, паводле А. Ніякоўскай, «перажывалі ў гэты час і трагічныя наступствы вызваленчага руху, і падзеі Першай сусветнай вайны, і драматычныя змены ўзаемадзеяння палітычных сіл, знішчэнне насельніцтва, гаспадаркі, здабыткаў нацыянальнай культуры і мастацтва. Менавіта гэтыя падзеі сталі прычынай нараджэння мадэрнісцкай танальнасці ў літаратурнай творчасці многіх ... паэтаў» [3, с. 25].

Пачатак XX ст. быў вельмі плённым для Беларусі, змясціўшы ў сябе шматлікія супярэчнасці пераходнай эпохі, перамены ў духоўнай, сацыяльнай, культурнай сферах, палітычныя ўзрушэнні. У гэты час узрастае інтэнсіўнасць грамадска-культурнага жыцця: ствараюцца выдавецкія таварыствы («Загляне сонца і ў наша аконца», «Беларускае выдавецкае таварыства», «Наша хата» і інш.), выходзяць часопісы і газеты («Маладая Беларусь», «Крапіва», «Саха» і інш.), якія становяцца важнымі пляцоўкамі для публікацыі літаратурных твораў, асвятлення актуальных падзей і абмеркавання культурных і грамадскіх пытанняў. Гэтыя працэсы суправаджаюцца выданнем знакавых літаратурных зборнікаў такіх пісьменнікаў, як Янка Купала, Якуб Колас, Цётка, М. Багдановіч і іншых, якія прадвызначылі далейшае развіццё беларускага прыгожага пісьменства і аказалі значны ўплыў на грамадскую свядомасць і культурнае жыццё краіны.

У навуковым асяроддзі разгляд тагачаснай беларускай літаратуры ўключае шматгранны аналіз, які ахоплівае розныя культурныя, эстэтычныя, моўныя і ідэалагічныя аспекты, што дазваляе больш поўна ацаніць яе багацце і разнастайнасць. Так, Н. Якуш робіць такое назіранне: «Дынамізм сацыяльных працэсаў, звязаных з капіталістычнай мадэрнізацыяй форм гаспадарання, усталяванне навуковага светапогляду і структурная перабудова грамадства істотна паўплывалі на эстэтычна-мастацкае афармленне культурнай прасторы. У пачатку XX стагоддзя назіралася і сінкрэтычнае, і эклектычнае спалучэнне фальклорных вытокаў, беларускіх культурных архетыпаў, традыцыйных выразных мастацкіх форм з новымі стылявымі накірункамі, выяўленчымі прыёмамі, метадамі. Такое спалучэнне традыцыі і эстэтыкі мадэрнізму ў рознай ступені закранула ўсе сферы беларускага мастацтва, вылівалася ў дыскусійнасць, эксперыментатарства, духоўную актыўнасць» [4, с. 118].

Беларускае прыгожае пісьменства ў гэты перыяд дэманструе інтэнсіўнае засваенне эстэтычных дасягненняў еўрапейскага мастацтва, паслядоўна ўключаецца ў сусветны літаратурны працэс, пры гэтым захоўвае ўласнае нацыянальнае аблічча, стварае ўнікальны нацыянальны стыль і нормы мастацкай творчасці. Мае рацыю В. Максімовіч, сцвярджаючы, што «літаратура пачатку XX стагоддзя ўяўляе з сябе яскравы прыклад сінтэтычнага засваення мастацкіх феноменаў, удалае спалучэнне разнастайных мастацкіх мадэляў з неабходным задзейнічаннем усяго мысленча-фенаменалагічнага, культуралагічнага патэнцыялу нацыі, што натуральна стасавалася як з эстэтычнымі прынцпамі літаратуры, так і агульнымі тэндэнцыямі эпохі з яе імкнёнасцю да спасціжэння аб’ектыўных закана-

мернасцяў жыцця, схільнасцю да разамкнёнасці, інтэгравання матэрыялу ў арганічным мастацкім цэлым» [5, с. 322]. У гэтым кантэксце можна весці размову пра феномен паскоранага развіцця беларускай літаратуры, які быў звязаны як з сацыяльна-гістарычнымі ўмовамі, так і дынамікай грамадска-культурных падзей.

Станаўленне творчай індывідуальнасці Максіма Багдановіча (1891–1917) адбывалася ў кантэксце тагачасных міжкультурных і міжнацыянальных узаемадачыненняў з ўлікам асноўных тэндэнцый мадэрнісцкага руху. З гэтага пункту гледжання актуальным з'яўляецца зварот да мастацкай спадчыны беларускага майстра слова, які творча ўвабраў у сваю пісьменніцкую практыку навейшыя тэндэнцыі і кірункі, пераасэнсаваў філасофска-эстэтычныя ідэі тагачаснай гісторыка-культурнай эпохі, і праз гэта сфарміраваў уласны мастацкі стыль, прадэманстраваўшы сваёй справай сувязь з агульнаеўрапейскім літаратурным кантэкстам і ўвасобіўшы гістарычныя і эстэтычныя праблемы свайго часу, асяроддзя, народа. Мэта даследавання – вылучыць найбольш актуальныя з пункту гледжання параўнальна-тыпалагічнага вывучэння літаратурныя з'явы еўрапейскіх краін пачатку XX ст. і на гэтай аснове выявіць важнейшыя моманты станаўлення і развіцця мастацкай сістэмы М. Багдановіча, адзначыць уплыў тагачасных сацыякультурных працэсаў на фарміраванне яго творчай індывідуальнасці.

Дзейнасць гэтага пісьменніка-наватара развівалася ва ўмовах вострых сацыяльна-палітычных узрушэнняў, упадніцкіх грамадскіх настрояў. У такія перыяды крызісаў і нявызначанасці абвастраецца ўвага да спрадвечных каштоўнасцей і экзістэнцыяльных пытанняў прысутнасці чалавека ў гэтым свеце, што з'яўляецца не толькі спосабам самапазнання, але і спосабам справіцца з выклікамі часу.

Не прымаючы тагачаснай рэчаіснасці, беларускі майстар слова супрацьпаставіў ёй агульначалавечыя каштоўнасныя арыенціры. Касмізацыя свядомасці М. Багдановіча звязана з яго імкненнем знайсці гармонію паміж асабістым і грамадскім, нацыянальным і сусветным, што знайшло адлюстраванне ў яго творах, дзе лірычныя вобразы часта пераплятаюцца з філасофскімі разважаннямі аб месцы чалавека ў свеце, духоўных пошуках і культурных каранях. Ва ўмовах палітычнай нестабільнасці і сацыяльных змен ён шукаў апірышча ў гістарычным мінулым, нацыянальнай культуры і адвечных каштоўнасцях, узнімаючы пытанні духоўнай сувязі чалавека і свету як адзінага космапрыроднага цэлага.

Змены ў сацыяльна-культурным жыцці абумовілі зварот М. Багдановіча да эстэтыкі мадэрнізму, які ў той час, па словах В. Каваленкі, «з'яўляўся ўладаром думак многіх пісьменнікаў» [6, с. 210], але ў творчасці

беларускага паэта гэты феномен атрымаў унікальную інтэрпрэтацыю і мастацкае пераўвасабленне. У 1913 г. выйшаў яго зборнік вершаў «Вянок», дзе малады творца здолеў аб'яднаць усе знакавыя тэндэнцыі і лініі развіцця тагачаснай беларускай паэзіі. З падобнага пункту гледжання зыходзіць і І. Багдановіч, якая сцвярджае, што беларускі майстар слова «...адразу з першых публікацый ... надаў новае дыханне маладой беларускай літаратуры. А "Вянок" як ідэйна-мастацкае цэлае ўжо адлюстраваў цэлую эстэтычную эпоху, засвоеную нашым прыгожым пісьменствам» [7, с. 178].

Сведчаннем шматграннага таленту беларускага пісьменніка-наватара з'яўляецца яго імкненне да новых сродкаў адлюстравання навакольнай рэчаіснасці, удасканалення мастацкіх форм і прыёмаў, пошуку новых паэтычных магчымасцей. М. Багдановіч унёс значны ўклад у беларускую літаратуру, прапанаваўшы новую форму светаразумення, у цэнтры якой знаходзіцца асоба. У яго творах акцэнт зроблены на суб'ектыўных перажываннях, якія служаць спосабам выражэння духоўных каштоўнасцей лірычнага героя і паглыбленага філасофскага асэнсавання прыродных законаў («Добрай ночы, зара-зараніца!», «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» і інш.). Паэзія М. Багдановіча прасякнута гуманістычным стаўленнем да жыцця і чалавека, а праблема нацыянальнага самавызначэння займае важнае месца ў яго творчасці, што праяўляецца ў звароце да культурнай і гістарычнай спадчыны беларускага народа («На Лявонавай кашулі вышыты галубкі», «Лявоніха», «Скірпуся», «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык» і інш.). У адпаведнасці з уласнай задумкай і мастацкай канцэпцыяй беларускі пясняр у сваіх творах па-майстэрску перапрацоўвае і пераўтварае старажытныя матывы, пакідаючы толькі намёк на першакрыніцы. Аўтар аддае перавагу іх суб'ектыўнаму ўспрыманню і інтэрпрэтацыі, але пры гэтым не губляе сувязі з рэальнасцю.

М. Багдановіч у сваіх творах не абвяргае рэалізм, а, наадварот, паднімае яго на новы ўзровень, падкрэсліваючы эстэтычную каштоўнасць зямнога існавання. Ён бачыць прыгажосць у штодзённым і імкнецца перадаць гэтае бачанне праз мастацкае слова. Яго лірыка насычана тонкімі назіраннямі за навакольным светам, выявамі прыроды, якія не толькі перадаюць аб'ектыўную рэальнасць, але і напаўняюць яе глыбокім сэнсам і эстэтычнай прыгажосцю («Добрай ночы, зара-зараніца!», «Блішчыць у небе зор пасеў», «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог» і інш.). Паэт выкарыстоўвае рэалістычныя дэталі для стварэння вобразаў, якія выклікаюць у чытача эмацыянальны водгук і дазваляюць убачыць у паўсядзённым прыроднае хараство і сусветную гармонію.

Да мадэрнізму ж М. Багдановіч звяртаецца свядома: не толькі з мэтай пашырэння уласных паэтычных гарызонтаў, але і інтэграцыі беларускай культуры ў еўрапейскі кантэкст, выкарыстоўваючы пры гэтым багаты спектр мастацкіх прыёмаў і форм. Тут дарэчы будзе выказванне Т. Вабішэвіч: «Багдановіч прыйшоў да еўрапейскасці як крытэру ацэнкі нацыянальнага літаратурнага працэсу праз вывучэнне і аналіз гісторыі развіцця еўрапейскіх літаратураў. Пад еўрапейскасцю паэт разумее наяўнасць у нацыянальнай літаратуры разнастайных літаратурна-мастацкіх метадаў і кірункаў, а таксама захаванне нацыянальнай самабытнасці як умовы каштоўнасці для агульнаеўрапейскай культуры» [8, с. 52].

У паэзіі М. Багдановіча назіраюцца ключавыя рысы мадэрнізму: індывідуалізм, увага да ўнутранага свету чалавека, імкненне да глыбокага філасофскага асэнсавання рэчаіснасці і інтуітыўнага спазнання свету, цікавасць да фальклорных першакрыніц, уласная міфатворчасць і г. д. Яго паэзія адрозніваецца глыбокай змястоўнасцю і пошукам сэнсаў існавання («Вечар», «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог...», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...», «Зорка Венера» «Ціха па мяккай траве», «На золку», «Да сястры» і інш.).

У паэтычнай спадчыне М. Багдановіча спалучаюцца шматлікія тэндэнцыі і ўплывы (рэалістычныя, рамантычныя, імпрэсіяністычныя, сімвалісцкія і інш.), што дазваляе разглядаць яго творчасць у розных кантэкстах і аспектах. Так, напрыклад, У. Конан бачыць паэтычнае майстэрства беларускага песняра «ў арганічнай знітаванасці сардэчнага і чыстага лірызму з сімвалічным метафарызмам» [9, с. 175]. Л. Тарасюк акцэнтуе ўвагу на тым, што «менавіта творчая практыка паэтаў-сімвалістаў дапамагала Багдановічу вызначыць уласныя шляхі мастацкага развіцця, узбагачэння паэтыкі» [10, с. 61] і прыводзіць пэўныя прыклады праяўлення сімвалісцкай эстэтыкі ў яго творчасці (паглыблены лірызм, суб'ектывізм, эмацыянальнасць, урбаністычныя матывы і г. д.). Пры гэтым даследчыца звяртае ўвагу і на ўплывы імпрэсіянізму на маладога паэта, які ўспрымае навакольны свет «у дынаміцы, імгненнасці яго праяваў, імкненне зафіксаваць першаснае, свежае ўражанне і стварыць на яго аснове цэласны малюнак убачанага, пачутага, перажытага» [10, с. 66].

Шырокі спектр інтарэсаў і ведаў, глыбокае знаёмства з культурнай і фальклорнай спадчынай розных народаў аказалі вялікі ўплыў на фарміраванне творчай індывідуальнасці М. Багдановіча і стварэнне ўласнага мастацкага стылю. Беларускі майстар слова актыўна ўдзельнічаў у літаратурным жыцці Расіі, што было абумоўлена як біяграфічнымі фактарамі, так і культурнымі кантактамі з дзеячамі гэтай краіны.

Бясспрэчным з’яўляецца факт уплыву прадстаўнікоў рускага сімвалізму (К. Бальмонта, А. Белага, А. Блока, В. Брусава, У. Салаўёва і інш.) на мастацкі досвед беларускага паэта: імкненне да меладычнасці верша, мадэляванне ўніверсальных пытанняў, спалучэнне фальклорнай і літаратурнай традыцый ва ўласнай творчасці.

Спецыфіка сацыякультурнай сітуацыі пачатку ХХ ст., напружаны рытм эпохі, тагачасныя філасофскія канцэпцыі, ідэі касмізму і сусветнага ўсеадзінства, папулярныя ў асяроддзі пісьменнікаў-сімвалістаў, актывізавалі іх цікавасць да міфафальклорных крыніц, што дазваляла, як тонка заўважыў І. Навуменка, «стварыць вельмі абагульненую сімвалічную карціну рэальна існуючага свету» [11, с. 14].

М. Багдановіч у сваёй пісьменніцкай практыцы актыўна звяртаецца да міфалагічных і фальклорных архетыпаў, якія выступаюць і як інструмент арганізацыі мастацкай структуры твораў, і як сродак выяўлення праблем універсальнага характару (чалавек і свет, часовае і вечнае, смерць і жыццё, рэальнасць і ідэалы). Матывы і вобразы, якія ўзыходзяць да міфалогіі розных народаў свету, дазволілі аўтару надаць сваім творам філасофскую глыбіню і мастацкую выразнасць.

Беларускі майстар слова, натхнёны старажытнымі паданнямі, пераносіць чытача ў іншую рэальнасць, іншае вымярэнне – «зачараванае царства» (нізка вершаў «У зачарованым царстве»), дзе перад чытачом паўстаюць казачныя істоты з далёкай мінуўшчыны (Вадзянік, Змяіны цар, Лясун, Падвей, русалкі). Такі падыход дае магчымасць пісьменніку не толькі ўвасобіць гістарычныя і эстэтычныя праблемы свайго часу, свайго народа, але і перадаць глыбіню духоўнага вопыту і спрадвечных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў легендах і міфах. Гэтага погляду на праблему прытрымліваецца і І. Навуменка, які адзначае наступнае: «Як і паэты-сімвалісты … Багдановіч цікавіцца сваёй мінуўшчынай, міфалогіяй з яе вобразамі-зданямі, напаўняе свой верш філасофскім роздумам аб сутнасці існага», імкнучыся «ахапіць мысленным позіркам малюнак светабудовы, разгадаць яе загадкі, таямніцы» [11, с. 4].

Міфалагічныя і фальклорныя элементы адыгрываюць важную ролю ў мастацкай сістэме М. Багдановіча, дапамагаюць аўтару ствараць глыбокія, шматзначныя вобразы, якія надаюць яго творам асаблівую эмацыянальную і філасофскую значнасць, адлюстроўваючы ўнутраныя канфлікты і пошукі гармоніі, уласцівыя тагачаснай эпохе.

Такім чынам, пачатак ХХ ст. стаў часам інтэнсіўнага культурнага абнаўлення для еўрапейскіх краін, узнікнення і развіцця новых форм і ідэй, якія паўплывалі на далейшае развіццё літаратуры і мастацтва

ў цэлым. Змена эпістэмалагічнай і эстэтычнай парадыгмаў у культуры пачатку XX ст., адзначаная рознымі трансфармацыямі, знайшла сваё адлюстраванне ў творчасці беларускага паэта М. Багдановіча. Пісьменніцкая дзейнасць гэтай выдатнай асобы з'яўляецца яскравым прыкладам плённага ўзаемадзеяння беларускай і еўрапейскай культур. Ён спалучаў у сваіх творах розныя тэндэнцыі і кірункі, што дазволіла яму стварыць унікальны мастацкі свет, насычаны глыбокімі ідэямі і багатымі вобразамі. Працэсы, характэрныя для пачатку XX ст., аказалі значны ўплыў на літаратурную дзейнасць М. Багдановіча, садзейнічалі фарміраванню творчай індывідуальнасці і дазволілі выказаць важныя светапоглядныя пытанні праз прызму ўласнай творчасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Васючэнка, П. В.* Славянскі сімвалізм: нацыянальна-адметнае і агульнае / П. В. Васючэнка // XII Міжнар. з'езд славістаў. – Мінск : МДЛУ, 1998 – 18 с.
2. *Максімовіч, В. А.* Беларускі мадэрнізм: эстэтычная самаідэнтыфікацыя літаратуры пачатку XX стагоддзя / В. А. Максімовіч. – Мінск : БДУ, 2001. – 228 с.
3. *Ніякоўская, А.* Максім Багдановіч і славянскі мадэрнізм / А. Ніякоўская // Кантакты і дыялогі. – 1998. – № 7/8. – С. 18–28.
4. *Якуш, Н. М.* Эстэтыка мадэрнізму і традыцыя ў беларускай культуры пачатку XX стагоддзя / Н. М. Якуш // Труды Белорусского государственного университета. Серия V, Политология, философия, история, филология. – Минск : БГТУ, 2008. – Вып. XVI. – С. 118–120.
5. *Максімовіч, В. А.* Мадэрнізм – рэалізм – барока ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя / В. А. Максімовіч // Беларусь і беларусы ў прасторы і часе : зб. да 75-годдзя прафесара Адама Мальдзіса / пад рэд. С. Запрудскага [і інш.]. – Мінск : Лімарыус, 2007. – С. 316–322.
6. *Каваленка, В. В.* Дэкадэнцтва / В. В. Каваленка // Максім Багдановіч : энцыкл. / склад. І. У. Саламевіч, М. В. Трус. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2011. – С. 208–210.
7. *Багдановіч, І. Э.* Мастацкая апалогія хараства: феномен Максіма Багдановіча / І. Э. Багдановіч // Авангард і традыцыя / І. Э. Багдановіч. – Мінск : Бел. навука, 2001 – С. 171–193.
8. *Вабішэвіч, Т.* Канцэпцыя еўрапеізацыі беларускага мастацкага слова як асноватворны элемент літаратурнай традыцыі Максіма Багдановіча / Т. Вабішэвіч // «Я не самотны, я кнігу маю...» : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 2003 г. / Літаратурны музей М. Багдановіча ; рэдкал.: Т. Э. Шэлеговіч [і інш.] .– Мінск, 2004. – С. 44–54.

9. *Конан, У. М.* Святло паэзіі і цені жыцця: лірыка Максіма Багдановіча / У. Конан. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 208 с.
10. *Тарасюк, Л. К.* Апалогія красы: кніга пра беларускую паэзію / Л. К. Тарасюк. – Мінск : Права і эканоміка, 2003. – 141 с.
11. *Навуменка, І. Я.* Максім Багдановіч / І. Я. Навуменка. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 141 с.

*Поступила в редакцию 19.06.2024*